Віктар Міхайлавіч Ананіч

З Вікіпедыі, свабоднай энцыклапедыі

Віктар Міхайлавіч Ананіч (нар. 5 чэрвеня 1963, Бабруйск Магілёўскай вобласці) — беларускі фінансіст, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 7-га склікання.

Віктар Міхайлавіч Ананіч	
Кіраўнік[D]	
з 23 сакавіка 2017	
Нараджэнне	5 чэрвеня 1963[1] (59 гадоў) Бабруйск, Магілёўская вобласць, БССР, СССР[1]
Адукацыя	Мінскі фінансава-эканамічны каледж Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь
Дзейнасць	фінансіст, палітык
Месца працы	Пріорбанк ААТ ААТ ААБ Беларусбанк[2]

Біяграфія

Скончыў Мінскі фінансава-эканамічны каледж па спецыяльнасці Банкаўская справа, Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт па спецыяльнасці Фінансы і крэдыт, Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці Фінансавы і банкаўскі менеджмент.

У банкаўскай сферы з 1995 года з пасады эканаміста філіяла № 302 АКБ Пріорбанк у г. Бабруйску.

Працаваў намеснікам кіраўніка філіяла, начальнікам аддзела аддзялення ГУ Нацыянальнага банка па Магілёўскай вобласці ў г. Бабруйску, начальнікам упраўлення эканомікі Бабруйскага гарвыканкама, намеснікам кіраўніка адміністрацыі Ленінскага раёна г. Бабруйска.

У ААТ «ААБ Беларусбанк» з 27 снежня 2006 года, даты ўступлення на пасаду дырэктара філіяла № 703 у г. Бабруйску. У снежні 2011 узначаліў філіял № 700 — Магілёўскае абласное ўпраўленне.

Выбіралася членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 7-га склікання[3].

Узнагароды

Узнагароджаны Ганаровымі граматамі ААТ «ААБ Беларусбанк» і мясцовых органаў улады[4].

Зноскі

1. http://sovrep.gov.by/ru/senators-ru/view/ananich-viktor-633/ (http://sovrep.gov.by/ru/senators-ru/view/ananich-viktor-633/)
2. https://belarusbank.by/en/about_bank/10523 (https://belarusbank.by/en/about_bank/10523)
3. Ананич Виктор Михайлович (http://sovrep.gov.by/ru/senators-ru/view/ananich-viktor-633/) Архівавана (https://web.archive.org/web/20201021151748/http://sovrep.gov.by/ru/senators-ru/view/ananich-viktor-633/) 21 кастрычніка 2020.
4. Ананіч Віктар Міхайлавіч (https://belarusbank.by/be/33139/33142/rukovodstvo/pravlenie/Ananich) (недаступная спасылка)

Узята з "https://be.wikipedia.org/w/index.php?title=Віктар_Міхайлавіч_Ананіч&oldid=4256924"